Ганчарова-Цынкевіч Т.У., Мельнікава Т.М.(Мінск)

# Паэзія і публіцыстыка Якуба Коласа перыяду Вялікай Айчыннай вайны.

Якуб Колас – адзін з самых буйных мастакоў слова ХХ стагоддзя: паэт, празаік, драматург, публіцыст. Яго творы карыстаюцца папулярнасцю і сёння ў сучаснага чытача. Перакладзеныя на многія замежныя мовы, яны сталі здабыткам культуры шматлікіх народаў, узбагацілі сусветную і нацыянальную літаратуру.

За многія гады сваёй літаратурнай дзейнасці Я.Колас стварыў вялікую колькасць высокамастацкіх твораў на самыя розныя тэмы з жыцця беларускага народа: побыт сялян у дакастрычніцкі час, барацьба за лепшую долю ў часы царызму, героіка дзён Кастрычніцкай рэвалюцыі, перамога і гераічныя дні ў час іншаземнай інтэрвенцыі, грамадзянскай вайны, аднаўленне гаспадаркі ў савецкі час, а таксама самаахвярнае змаганне нашых людзей з фашысцкімі захопнікамі ў час Вялікай Айчыннай вайны, самаадданая праца ў пасляваенны перыяд, – усё гэта знайшло адлюстраванне ў творчасці народнага паэта Беларусі.

Гады Вялікай Айчыннай вайны з'явіліся ў жыцці беларускага народа сур'ёзнай праверкай усіх яго сіл. Вайна паставіла новыя задачы і перад шматнацыянальнай літаратурай народаў былога Савецкага Саюза. У суровыя дні выпрабаванняў пісьменнікі былі разам са сваім народам. Тэма лёсу Радзімы знаходзіць цяпер, як ніколі раней, глыбока эмацыянальнае і ў той жа час своеасаблівае мастацкае ўвасабленне ў творчасці такіх беларускіх пісьменнікаў, як Якуб Колас, Янка Купала, Пятрусь Броўка, Максім Танк, Аркадзь Куляшоў, Кузьма Чорны, Пімен Панчанка, Міхась Лынькоў, Пятрусь Глебка, Янка Брыль, Анатоль Вялюгін і інш..

Вялікая Айчынная вайна застае Я.Коласа за работай над паэмай аб Беларусі "На шляхах волі". Аднак у полымі пажару гарыць яго дом, бібліятэка, гіне і рукапіс гэтага незакончанага твора. Пакінуўшы Беларусь, паэт знаходзіцца ў далёкім Узбекістане, дзе напружана працуе, аддаючы ўсю моц свайго таленту святой справе барацьбы і перамогі над фашыстамі.

За час вайны з друку выйшлі зборнікі вершаў беларускага песняра "Адпомсцім" (1942), "Голас зямлі" (1943), паэмы "Суд у лесе" (1943), "Адплата" (1945) і інш..

Асноўная ідэя твораў ваеннага перыяду Я.Коласа – ідэя патрыятызму і перамогі над ворагам. Паэт востра перажываў горыч разлукі са сваёй зямлёй, зруйнаванай фашыстамі:

Зямля мая, нябёсаў родных сінь,
Лугоў зялёныя пасцелі!
Вы ўстаяце з-за смутных далячынь
Скрозь горы і пустэлі.
Празрыстасць рэк, дубоў жывы шалаш,
Дарог нязлічаных красёнцы!
Вас бачу я, я чую голас ваш,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Прываблівы, як сонца.

(“У цяжкую часіну”, 1, с.211)

З глыбокім хваляваннем паэт расказвае аб пакутах і спусташэнні роднай Беларусі:

Спаліў твае сялібы, гарады,
Твой дом разграбіўшы дарэшты.
Не ведаў ты яшчэ такой бяды
З тых дзён, як тут жывеш ты.

(“У цяжкую часіну”, 1, с.211)

Думка аб паланёнай, але няскоранай краіне не пакідала Я.Коласа ні на хвіліну, пакуты і няшчасці людзей на акупіраванай тэрыторыі глыбокім болем адгукаліся ў яго сэрцы:

Не плач, зямля! Народ мой, не тужы –
Вышэй ўзнімі сваю сякеру!
За здзек, за кроў, за грабяжы –
На Гітлера, на звера!

(“У цяжкую часіну”, 1, с.211-212)

Ідэйны змест лірыкі Коласа ваеннага часу не абмяжоўваўся адлюстраваннем трагічных момантаў. Паказваючы суровую рэчаіснасць, мастак слова з упэўненасцю гаворыць пра хуткую перамогу. Яго паэзія насычана аптымістычным пафасам і рамантыкай геранчнага подзвігу. Паэт ні на хвіліну не сумняваецца, што беларуская зямля будзе вызвалена:

Зямля мая, мая краіна!
Я чую твой прызыўны звон.
Прымі ж хоць словы твайго сына –
Не доўгі будзе твой палон.
Шумяць гняўліва твае пушчы,
Трасуцца помстаю бары,
І дзень твой хмурны зрок расплюшчыць –
Ёсць у цябе багатыры!

(“Голас зямлі”, 1, с.218)

Патрыятычныя вершы Я.Коласа глыбока нацыянальныя, таму што выяўляюць моц і сілу народнага характару.

Гарачую любоў да сваёй Радзімы народны пясняр спалучаў з барацьбой усяго прагрэсіўнага чалавецтва супраць фашысцкага нашэсця, таму яго творы інтэрнацыянальныя па змесце і прасякнуты пачуццём сяброўскіх адносін многіх народаў, што сплаціліся ў імя перамогі над карычневай чумой. Так, у вершы “Песня пілота” паэт славіць байцоў-узбекаў, якія адважна змагаюцца за агульную справу. Шмат высокамастацкіх радкоў напісана Коласам аб гераізме ўзбекскага народа (“Чымган”, “Салар”, “Узбекістану” і інш.).

Сваёй творчасцю паэт заклікаў вольналюбівыя народы даць дастойны адпор агрэсару:

Да зброі, народы раскутай краіны:
Разбойнік штурмуе наш дом!

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Магутнаю раццю, патокам адзіным
Абрушым на ворага гром!
…Дык чуйце, народы: ў паход на бандыта
На меч перакуйце свой плуг.
Захочам – і Гітлер, як пёс будзе біты:
Шалёнага пса – на ланцуг!

(“Шалёнага пса – на ланцуг!”, 1, с.180)

Гэты гнеўны, глыбока эмацыянальны, патрыятычны верш быў напісаны ў першыя дні Вялікай Айчыннай вайны і апублікаваны ў газеце “Правда” 24 чэрвеня 1941 года.

Усведамляючы народны характар барацьбы, сваю адказнасць перад гісторыяй, Я.Колас услаўляе гераічныя подзвігі байцоў Чырвонай Арміі на фронце і партызан у тыле ворага (“Абаронцам роднай зямлі”, “Маскве”, “На звера”, “Капайце яму, далакопы”, “Адпомсцім”, “Душою і сэрцам мы з вамі, героі”, “Чырвонай Арміі”, “Бацьку Мінаю” і інш.).

Вельмі запамінальным намаляваў паэт рэальны вобраз легендарнага партызанскага камандзіра бацькі Міная ў аднайменным вершы. Фашысты расстралялі яго сям’ю, але асабістае гора не зламіла волю гэтага чалавека, і ён з яшчэ большай мужнасцю працягвае змагацца за вызваленне і свабоду свайго краю:

Паклон табе шчыры і нізкі,
Наш бацька Мінай.
Ты стаўся нам родны і блізкі:
Ты – гэта наш край.

(“Бацьку Мінаю”, 1, с.239)

У вобразе бацькі Міная, узнятыя да вышыні мастацкага абагульнення, увасоблены рысы народа-барацьбіта, героя Вялікай Айчыннай вайны.

Побач з лірычнай публіцыстыкай у гады вайны паэт звяртаецца і да сатырычных вершаў, палітычных памфлетаў (“Смерць разбойнікам”, “Фашысцкім бандытам”, “Крумкачы”, “На восі Рым – Берлін” і інш.). Карыстаючыся сродкамі сатыры, Я.Колас выкрывае антычалавечую сутнасць фашысцкай ідэалогіі.

Вершы паэта ваеннага часу вызначаюцца непасрэднай шчырасцю, ім характэрна глыбіня і празрыстасць думкі, паэтычная канкрэтнасць, а таксама і каларыт фальклору. Паэтычныя творы беларускага мастака слова клікалі да барацьбы за незалежнасць чалавека і краіны, з’яўляліся выяўленнем узрастаючага ўмацавання адзінства і сяброўства ўсіх народаў у імя перамогі над крыважэрным ворагам.

Я.Колас у перыяд Вялікай Айчыннай вайны вёў вялікую грамадска-публіцыстычную дзейнасць. У шматлікіх артыкулах і публіцыстычных выступленнях таго часу ён удзяляў увагу непарушнай дружбе славянскіх народаў. Гэтай тэме ён прысвяціў такія артыкулы, як “Славяне борются”, “К мести, братья славяне!”, “Совместная борьба русского и белорусского народов против немецкой агрессии” і інш., заклікаючы народы аб’яднацца для барацьбы з цёмнымі сіламі фашызму, за сваю свабоду і незалежнасць: “В

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

грозные дни войны славянские народы, против которых в первую очередь направлена гитлеровская агрессия, как никогда, должны быть сплочены единством общего устремления – сокрушить лютого врага. Славянские народы хорошо поняли и осознали это. Всеми доступными средствами они борются против кровавого гитлеризма. Вместе со своими русскими братьями украинский и белорусский народ, а с недавних пор и чешские воины сражаются на советско-германском фронте. В степях Украины, в лесах Белоруссии, в горах Югославии, на окровавленной земле Польши и Чехословакии бесстрашные партизаны пускают под откос фашистские эшелоны, взрывают склады, наносят удары по врагу. На советско-германском фронте решаются судьбы народов, спасение и свобода которых – в полном разгроме Гитлера" ("Славяне борются", 2, с.298). Далей аўтар заўважае, што перамога ўжо хутка, бо змагаецца супраць ворага ўвесь славянскі свет – рускія, беларусы, украінцы, чэхі, балгары, сербы, харваты, славенцы, палякі і інш.. Дружба і ўзаемная павага братніх народаў – вялікая сіла ў іх гістарычным поступе на шляху свабоды і прагрэсу.

У сваіх публіцыстычных артыкулах ваеннага часу "На бітву браты-беларусы!", "Да зброі, беларускі народ!", "Набліжаецца час расплаты", "Беларусы ніколі не аддадуць нямецкім захопнікам сваёй волі, сваёй зямлі, сваёй незалежнасці", "Воинам красной армии", "Злачынцы суда не мінуць", "Здраднікі" і інш., што друкаваліся на старонках "Правды", "Известий", франтавога і падпольнага друку "Звязда", "Савецкая Беларусь", "За свабодную Беларусь", "Партызанская дубінка", "Раздавім фашысцкую гадзіну", Я.Колас услаўляе патрыятызм і гераізм савецкага народа, выкрывае здраднікаў, адшчапенцаў, раскрывае сапраўднае аблічча фашысцкіх захопнікаў, іх грабежніцкія планы, антычалавечую палітыку, сцвярджае непахісную веру ў перамогу над фашызмам. Публіцыстычныя артыкулы ваеннага перыяду з'яўляюцца ўзорам аратарскай прозы пісьменніка.

Творчасць Якуба Коласа ў ваенныя гады стала вострай ідэйнай зброяй нашага народа. Яна дапамагала выхоўваць гераічныя якасці характару чалавека-змагара, набліжаючы тым самым дзень перамогі роднага краю.

## Літаратура


1. Колас, Я. Збор твораў у 14-ці т. / Я.Колас. – Мінск: Маст.літ., 1972. – 2т. – 568с.
2. Колас, Я. Збор твораў у 14-ці т. / Я.Колас. – Мінск: Маст.літ., 1976. – 11т. – 424с.
3. Купала, Я і Колас, Я: Некаторыя аспекты творчасці. Пад рэд. А.Семяновіча / Я.Купала і Я.Колас. – Мінск: Вышэйшая школа, 1982. – 262с.


-------------------------------------------------------------------------------


Каласавіны. Якуб Колас і яго сучаснікі: да вывучэння творчых і асабістых узаемасувязей пісьменніка. Матэр.XXV навук. канф., 3 лістапада 2010г., с.79-84.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ